**1. Заданне “Імя пісьменніка”**

Суаднясіце імя і прозвішча пісьменніка з імем па бацьку:

| Імя і прозвішча пісьменніка | Імя па бацьку |
|---|---|
| 1. Іван Шамякін | I. Сымонавіч |
| 2. Андрэй Макаёнак | II. Пятровіч |
| 3. Янка (Іван) Брыль | III. Ягоравіч |
| 4. Васіль Быкаў | IV. Іванавіч |
| 5. Уладзімір Караткевіч | V. Уладзіміравіч |
| 6. Міхась Стральцоў | VI. Лявонавіч |
| 7. Ніл Гілевіч | VII. Захаравіч |
| 8. Іван Чыгрынаў | VIII. Ануфрыевіч |
| 9. Іван Навуменка | IX. Сцяпанавіч |
| 10. Рыгор Барадулін | X. Сямёнавіч |
| 11. Алесь (Аляксандр) Разанаў | XI. Антонавіч |
| 12. Георгій Марчук | XII. Гаўрылавіч |
| 13. Аляксей Дудараў | XIII. Якаўлевіч |
| 14. Міхась (Міхаіл) Башлакоў | XIV. Васільевіч |

Адказы: 1 – II. 2 – III. 3 – XI. 4 – V. 5 – X. 6 – VI. 7 – I. 8 – XII. 9 – XIII. 10 – IV. 11 – IX. 12 – XIV. 13 – VIII. 14 – VII.

**2. Заданне “Пісьменнікі-землякі”**

Размяркуйце пісьменнікаў у групы паводле агульнай малой радзімы. Іван Шамякін, Андрэй Макаёнак, Янка Брыль, Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Міхась Стральцоў, Ніл Гілевіч, Іван Чыгрынаў, Іван Навуменка, Рыгор Барадулін, Алесь Разанаў, Георгій Марчук, Аляксей Дудараў, Міхась Башлакоў.

| Віцебшчына | Магілёўшчына | Гомельшчына | Брэстчына |
|---|---|---|---|
| | | | |

Якія імёны двух пісьменнікаў не ўваходзяць ні ў адну групу? Чаму?________________________________________________________

Адказы:

| Віцебшчына | Магілёўшчына | Гомельшчына | Брэстчына |
|---|---|---|---|
| Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Рыгор Барадулін, Аляксей Дудараў | Міхась Стральцоў, Іван Чыгрынаў | Іван Шамякін, Андрэй Макаёнак, Іван Навуменка, Міхась Башлакоў | Алесь Разанаў, Георгій Марчук |

Два пісьменнікі, якія не ўваходзяць ні ў адну групу: Ніл Гілевіч (нарадзіўся на Міншчыне), Янка Брыль (нарадзіўся ў Адэсе, дзяцінства прайшло на Навагрудчыне – Гродзеншчына).

**3. Заданне “Месца нараджэння пісьменнікаў”**

Суаднясіце прозвішча пісьменніка з месцам яго нараджэння.

| Пісьменнік | Месца нараджэння |
|---|---|
| 1. Іван Шамякін | I. Хутар Верасоўка |

| | |
|---|---|
| 2. Андрэй Макаёнак | II. Вёска Карма |
| 3. Янка Брыль | III. Горад Орша |
| 4. Васіль Быкаў | IV. Мястэчка Васілевічы |
| 5. Уладзімір Караткевіч | V. Вёска Сялец |
| 6. Міхась Стральцоў | VI. Вёска Борхаў |
| 7. Ніл Гілевіч | VII. Горад Давыд-Гарадок |
| 8. Іван Чыгрынаў | VIII. Вёска Кляны |
| 9. Іван Навуменка | IX. Вёска Слабада |
| 10. Рыгор Барадулін | X. Горад Адэса |
| 11. Алесь Разанаў | XI. Пасёлак Станцыя Церуха |
| 12. Георгій Марчук | XII. Вёска Сычын |
| 13. Аляксей Дудараў | XIII. Вёска Бычкі |
| 14. Міхась Башлакоў | XIV. Вёска Вялікі Бор |

Адказы: 1 – II. 2 – VI. 3 – X. 4 – XIII. 5 – III. 6 – XII. 7 – IX. 8 – XIV. 9 – IV. 10 – I. 11 – V. 12 – VII. 13 – VIII. 14 – XI.

## 4. Заданне “Першыя творы і зборнікі”

Суаднясіце прозвішча пісьменніка з назвамі яго першых твораў.

| Пісьменнік | Першыя творы |
|---|---|
| 1. Іван Шамякін | I. Апавяданні “У той дзень”, “У першым баі” (1949 г.), газета “Гродзенская праўда” |
| 2. Андрэй Макаёнак | II. Апавяданне “Дома” (1957 г.), зборнік “Блакітны вецер” (1962 г.) |
| 3. Янка Брыль | III. Верш “Яблынька” (1946 г.), часопіс “Бярозка”, зборнік “Песня ў дарогу” (1957 г.) |
| 4. Васіль Быкаў | IV. П’еса “Добра, што добра канчаецца” (1946 г. ) |
| 5. Уладзімір Караткевіч | V. Кніга “Сямнаццатай вясной” (1957 г.) |
| 6. Міхась Стральцоў | VI. Верш “Машэка” (1955 г.), часопіс “Полымя”, паэтычны зборнік “Матчына душа” (1958 г.). |
| 7. Ніл Гілевіч | VII. Паэтычны зборнік “Маладзік над стэпам” (1959 г.) |
| 8. Іван Чыгрынаў | VIII. Верш “Сон трактарыста” (1952 г.), часопіс “Полымя”, апавяданне “Праз гады” (1961 г.), кніга апавяданняў і аповесцей «Птушкі ляцяць на волю» (1965) |
| 9. Іван Навуменка | IX. Зборнік “Адраджэнне” (1970 г.) |
| 10. Рыгор Барадулін | X. Аповесць “Помста” (1945 г.), часопіс “Полымя” |
| 11. Алесь Разанаў | XI. Кніга апавяданняў “Святая птушка” (1979 г.) |
| 12. Георгій Марчук | XII. Кніга “Апавяданні” (1946 г.) |
| 13. Аляксей Дудараў | XIII. Творы “На шляху да самастойнасці”, “Знаходка” (1973 г.), газеты “Літаратура і мастацтва”, “Чырвоная змена” |
| 14. Міхась Башлакоў | XIV. Кніга паэзіі “Касавіца” (1979 г.) |

Адказы: 1 – X. 2 – IV. 3 – XII. 4 – I. 5 – VI. 6 – II. 7 – III. 8 – VIII. 9 – V. 10 – VII. 11 – IX. 12 – XIII. 13 – XI. 14 – XIV.

## 5. Заданне “Стужка часу”

Вызначце паслядоўнасць выхаду ў свет твораў беларускіх пісьменнікаў, назавіце аўтараў твораў:




Адказы:

| Год | Твор | Аўтар |
|---|---|---|
| 1957 | “Загадка” | Янка Брыль |
| 1956 | “Сямнаццатай вясной” | Іван Навуменка |
| 1961 | “Дзівак з Ганчарнай вуліцы” | Іван Чыгрынаў |
| 1963 | “Сена на асфальце”<br>“Сэрца на далоні” | Міхась Стральцоў<br>Іван Шамякін |
| 1968 | “Каласы пад сярпом тваім” | Уладзімір Караткевіч |
| 1969 | “Зацюканы апостал” | Андрэй Макаёнак |
| 1982 | “Знак бяды” | Васіль Быкаў |
| 1993 | “Князь Вітаўт” | Аляксей Дудараў |

## 6. Заданне “Цытаты з твораў”

Запішыце, з якога твора цытата.

| Цытата | Назва твора, аўтар |
|---|---|
| 1. “На зямлі столькі добрага, прыгожага, столькі любові разліта, што не паспяваеш наталіць душу і напалову. Прызнавайся ўсяму жываму ў каханні, бо ў старасці на гэта не хопіць часу”. | |
| 2. “Клекачыце, буслы! Няхай жыве, як сонца, вечная паэзія! І тут, над нашай ракою”. | |
| 3. “Ніколі яшчэ бэз не расцвітаў так, як сёлета. Ён сінеў цэлымі азяркамі па садах, палісадніках, у нашым станцыйным скверыку”. | |
| 4. “Душа твая належыць толькі Богу і гэтым палям, шабля – ваяводзе справядлівай вайны, жыццё – усім добрым людзям, сэрца каханай. Але гонар і чэсць – яны належаць толькі табе і больш нікому”. | |
| 5. “Рабі дабро! Хоць нават коштам // Апошніх сіл, апошніх мук. // І не пытай: каму? завошта? // Рабі – без просьбаў і прынук! ” | |
| 6. “О зямля! Ты даеш нам тугу па небе, але не меншая наша туга па табе. З далёкіх і блізкіх дарог вяртаемся мы да цябе, і спеў | |

| | |
|---|---|
| жаваранка аглушае нас не меней, чым гул рэактыўнага самалёта”. | |
| 7. “Не кожная рана паддаецца лекам. Асабліва калі на душы”. | |

Адказы: 1. “Канон Маці”, Георгій Марчук. 2. “Трохі пра вечнае”, Янка Брыль. 3. “Сямнаццатай вясной”, Іван Навуменка. 4. “Каласы пад сярпом тваім”, Уладзімір Караткевіч. 5. “Родныя дзеці”, Ніл Гілевіч. 6. “Сена на асфальце”, Міхась Стральцоў. 7. “Дзівак з Ганчарнай вуліцы”, Іван Чыгрынаў.

## 7. Заданне “3 факты пра аўтара”

Адгадайце, пра якога пісьменніка гаворыцца.

| Факты | Пісьменнік |
|---|---|
| 1.<br>1) Народны паэт Беларусі (1991 г.), які пражыў 85 год;<br>2) Аўтар адзінага ў беларускай літаратуры рамана ў вершах;<br>3) Пераклаў на беларускую мову звыш 400 твораў славянскіх пісьменнікаў. | I. Алесь Разанаў |
| 2.<br>1) Талент пісаць вершы перадаўся ад бацькі – былога партызана і вязня;<br>2) Паэт-наватар, аўтар пункціраў, квартэмаў, зномаў;<br>3) Яго называюць не толькі беларускім паэтам, але і нямецкім. | II. Васіль Быкаў |
| 3.<br>1) Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, маёр запаса, літаратурны супрацоўнік газеты “Гродзенская праўда”;<br>2) Аўтар кнігі “Дажыць да зялёнай травы” (2008), якую разам з Рыгорам Барадуліным пісаў 43 гады;<br>3) Народны пісьменнік Беларусі (1980 г.), па творах якога пастаўлены шматлікія ваенныя кінафільмы. | III. Ніл Гілевіч |
| 4.<br>1) Галоўны рэдактар выдавецтва “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі”;<br>2) Аўтар першага ў беларускай літаратуры твора буйной жанравай формы чарнобыльскай тэматыкі – рамана “Злая зорка”;<br>3) Аўтар аповесці, прысвечанай жонцы, з якой пражыў 58 год, “Слаўся, Марыя!”, уласных дзённікаў “Роздум на апошнім перагоне”. | IV. Янка Брыль |
| 5.<br>1) Майстар лірычнай мініяцюры, аўтар кнігі “Жменя сонечных промняў”;<br>2) Былы ваеннапалонны, які напісаў пра гэта ў рамане “Птушкі і гнёзды”;<br>3) Суаўтар (А. Адамовіч, У. Калеснік) кнігі “Я з вогненнай вёскі…”. | V. Іван Шамякін |

Адказы: 1 – III. 2 – I. 3 – II. 4 – V. 5 – IV.

## 8. Заданне “Паэтычны радок”

Размяжуйце творы Рыгора Барадуліна і Алеся Разанава.

| Урывак з твора | Аўтар | Назва |
|---|---|---|
| 1. Цвітуць успаміны верасам.<br>Няяснае мроіцца-сніцца.<br>І моцна жадаецца-верыцца,<br>Што ўсё да паўдня праясніцца. | | |

| | | |
|---|---|---|
| 2. Чалавек не знікае так,<br>Бы ў кішэні вякоў пятак.<br>Ён сціраецца аб дарогі,<br>Разбіваецца аб адчаі,<br>Пераходзіць ва ўсе трывогі Веку,<br>Што яго прыручае. | | |
| 3. Слова,<br>што як нарог для ратая,<br>Як для ластаўкі –<br>стромы вільчак,<br>Ад якога на небе світае,<br>Ад якога яснее ў вачах… | | |
| 4. Я толькі спраўджваю тое, на што здатны, што<br>вымагае ад мяне жыццё:<br>засмяглы – п'ю ваду,<br>галодны – ем хлеб,<br>зняможаны – адпачываю,<br>адпачыўшы, імкнуся наперад – і апынаюся<br>на сваіх слядах. | | |
| 5. Ты не ўмяшчаешся ў куток, дзе трызніць Буг, дзе Белавежа... Тваe не вызначыць мне межы і не намацаць твой выток. | | |
| 6. Да горада горнуцца вёскі, лясы, пасады, палі, агароды, і ён з'ядноўвае іх у радзіму, а разнаісную грамаду – смердаў, рамеснікаў, гандляроў – гуртуе ў народ. І нават калі горад знішчаецца дашчэнту, згарае да гарадзішча, народ і радзіма становяцца тым радовішчам, з якога ён адраджаецца зноўку. | | |
| 7. Хацелася пачуць: "Сынок..."<br>І крыкнуць радаснае: "Тата!"<br>Бацькоўскім быў мне кожны крок...<br>Усё ішлі, ішлі салдаты... | | |
| 8. Калі яна цяжар – тады яна крылы, калі яна вярэдзіць – тады яна гоіць, калі яна знясільвае – тады дае сілу... | | |
| 9. Пакуль у нас<br>Пяшчотаю матуль<br>І рупнасцю бацькоў<br>Сагрэты далі,<br>Не посвіст куль,<br>А галасы зязюль<br>Лічыць гадоў чароды<br>Не прысталі. | | |

Адказы: 1. Р.Барадулін, "Заспаная раніца мжыстая…". 2. Р.Барадулін, "Чалавек не ўзнікае так…". 3. Р.Барадулін, "Неруш". 4. А.Разанаў, "У крузе". 5. А.Разанаў, "Радзіма". 6. А.Разанаў, "Горад". 7. Р.Барадулін, "Бацьку". 8. А.Разанаў, "Спадчына". 9. Р.Барадулін, "Яна адна, зямля вякоў…".

**9. Заданне "Веру – не веру"**

Адзначце знакам "+" тыя факты, якія характэрны для абодвух пісьменнікаў:

| | |
|---|---|
| **I. Мар’ян Дукса і Уладзімір Карызна:**<br>1. Аўтары Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.<br>2. Нарадзіліся ў адзін год.<br>3. Пісьменнікі-юбіляры 2023 года.<br>4. Нарадзіліся на Міншчыне.<br>5. З’яўляюцца аўтарамі твораў для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.<br>6. Пісьменнікі-сучаснікі, якія жывуць і працуюць у Мінску. | **II. Андрэй Макаёнак і Аляксей Дудараў**<br>1. Пісьменнікі-землякі.<br>2. Абодва ледзь не сталі ваеннымі.<br>3. Здымаліся ў кіно.<br>4. Драматургі.<br>5. П’есы “Зацюканы апостал” А. Макаёнка і “Вечар” А. Дударава – драмы.<br>6. У 1983 годзе выйшлі ў свет п’есы “Парог” А. Дударава і “Дыхайце эканомна” А. Макаёнка. |
| **III. Аркадзь Куляшоў і Іван Чыгрынаў**<br>1. Вучыліся ў адной школе ў вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна.<br>2. У абодвух на вайне забілі бацьку.<br>3. Маюць званні “Народны паэт” і “Народны пісьменнік”.<br>4. Пісалі творы на ваенную тэматыку.<br>5. Удзельнічалі ў рабоце сесій Генеральнай Асамблеі ААН як дэпутаты Вярхоўнага Савет БССР.<br>6. Суаўтары сцэнарыя фільма “Першыя выпрабаванні” (па трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”). | **IV. Рыгор Барадулін і Міхась Башлакоў**<br>1. Многія вершы паэтаў пакладзены на музыку.<br>2. Удзельнікі ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС.<br>3. Тэма Чарнобыля прысутнічае ў творчасці абодвух паэтаў.<br>4. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.<br>5. Займаліся падрыхтоўкай і выданнем кнігі “Памяць”.<br>6. З’яўляюцца аўтарамі твораў для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. |
| **V. Іван Навуменка і Міхась Стральцоў**<br>1. Прымалі актыўны ўдзел у падпольнай барацьбе ў час Вялікай Айчыннай вайны.<br>2. Пісьменнікі-землякі.<br>3. Працавалі на філалагічным факультэце БДУ.<br>4. Працавалі ў рэдакцыі часопіса “Маладосць”.<br>5. Першая кніга Івана Навуменкі “Сямнаццатай вясной” і першы твор Міхася Стральцова “Дома” з’явіліся ў 1957 годзе.<br>6. Аўтары крытычных твораў, прысвечаных Максіму Багдановічу. | **VI. Яўгенія Янішчыц і Раіса Баравікова**<br>1. Малая радзіма – Брэстчына.<br>2. Вучыліся ў адной школе.<br>3. Былі сяброўкамі.<br>4. Характэрна інтымная лірыка.<br>5. Узнагароджаны літаратурнай прэміяй імя Аркадзя Куляшова.<br>6. “Паэзія. Душа. Айчына” – радкі з верша Яўгеніі Янішчыц і артыкул Раісы Баравіковай пра Яўгенію Янішчыц. |

Адказы: I – 3, 4, 5.II – 2, 4, 6. III – 1, 3, 5. IV – 1, 3, 4. V – 4, 5, 6. VI – 1, 3, 4, 6.

### 10. Заданне “Літаратуразнаўчы рынг”

Вызначце, якія сцвярджэнні датычацца традыцыйнай літаратуры, а якія сучаснай. Запішыце замест шматкроп’яў неабходныя словы (*традыцыйная* або *сучасная*).

| | |
|---|---|
| 1. У … літаратуры пісьменнікаў цікавіць перадача ўласных, суб’ектыўных адносін, думак, эмоцый да разнастайнага навакольнага свету. | 2. … літаратура ўкладвалася ў некалькі традыцыйных жанраў, фармальных прыёмаў, канцэнтруючы сваю ўвагу на вядомых ісцінах. |

| | |
|---|---|
| 3. … літаратура выяўляе думкі і настроі пэўнага сацыяльнага асяроддзя, класа, адлюстроўвае сацыяльную барацьбу ў грамадстве, удзельнічае ў гэтай барацьбе. | 4. … літаратура імкнецца спасцігнуць саму сутнасць чалавечага існавання, матывацыю паводзін людзей розных пакаленняў, пазбягае даваць гатовыя адказы і рашэнні на пастаўленыя пытанні. |
| 5. … літаратура аддае перавагу цэнтральнай тэме – лёсу Беларусі і беларускага народа, арыентацыя на маральна-філасофскія, духоўныя каштоўнасці працавітага, гасціннага і гераічнага беларускага народа. | 6. У … літаратуры мастацкі твор – гэта не толькі забаўка для чытача, але мудры настаўнік, які вучыць, як размежаваць дабро і зло, выкрывае адмоўныя з'явы жыцця, усталёўвае дабрачыннасць і прыгажосць. |
| 7. … літаратура ўкладваецца ў тры вымярэнні: фальклорнае, побытавае і, у меншай меры, псіхалагічнае. У ёй няма філасофскай і інтэлектуальнай літаратуры. | 8. Наяўнасць у … літаратуры розных эстэтыка-выяўленчых кірункаў, плыняў, тэндэнцый: неарэалізму, неарамантызму, прыпавесційнасці, імпрэсіянізму, постмадэрнізму, неаміфалагізму. |
| 9. Вынікам мастацкіх пошукаў … літаратуры з'яўляюцца такія жанравыя формы, як танка, хоку, лімэрык, пагер-верш (у паэзіі), мроі, імпрэсіі, фрэскі, зацемкі, акварэлі, пятрогліфы (у прозе). | 10. Адной з асаблівасцей … беларускай літаратуры<br>становіцца яе інтэлектуалізацыя, арыентацыя на роздумнасць, медытатыўнасць. |

Адказ: 1, 4, 5, 8, 9, 10 (сучасная). 2, 3, 6, 7 (традыцыйная).

**11. Заданне "Сучасныя жанравыя формы"**

Суаднясіце назву жанра з азначэннем.

| Жанр | Азначэнне |
|---|---|
| 1. Хоку | I. Вершы-медытацыі, у якіх няма прычынна-выніковых сувязей, адсутнічаюць знакі прыпынку. |
| 2. Танка | II. Невялікі твор, паэтычны па змесце і празаічны па форме выяўлення гэтага зместу. |
| 3. Паліндром | III. Пяцірадкоўе, напісанае анапестам, у якім 1, 3, 5-ы радкі складаюцца з трох стоп, а 2-і, 4-ы – з дзвюх з рыфмоўкай аабба. |
| 4. Лімэрык | IV. Верш, які складаецца з трыццаці аднаго склада, а галоўная думка сканцэнтравана ў трох першых радках. |
| 5. Пагер-верш | V. Верш, які складаецца з сямнаццаці складоў пра жыццё прыроды і жыццё чалавека на фоне кругазвароту часоў года. |
| 6. Пункціры | VI. Кароткая вершаваная форма, паведамленне для пэйджараў без знакаў прыпынку, літар і, ў, ё, у якім пераважаюць перажыванні лірычнага героя. |
| 7. Квантэмы | VII. Верш, радкі якога ўтвараюць пэўную фігуру або выяву – трохвугольнік, ромб, квадрат, сэрца, крыж, зорку. |
| 8. Версэт | VIII. Мініяцюры з 4-6 радкоў, заснаваныя на перадачы адной думкі, фіксацыі аднаго пачуцця. |
| 9. Графічны верш | IX. Верш, які можна чытаць у адваротным парадку. |

Адказы: 1 – V. 2 – IV. 3 – IX. 4- III. 5 – VI. 6 – VIII. 7 – I. 8 – II. 9 – VII.

**12. Заданне "Героі твораў"**

Запішыце назву твора, жанр і аўтара. Які адзін герой лішні?

| Героі | Назва твора | Аўтар | Жанр | Лішні герой |
|---|---|---|---|---|
| Дзядька Ігнат, Арына, Віктар, Тамаш, цётка Аўгіння | | | | |
| Адольф Яхімоўскі, Сцепаніда, Пятрок, Міхал Кагут, Лявон Багацька | | | | |
| Алесь Загорскі, Чорны Война, Вежа, Майка Раўбіч, Мар'яна | | | | |
| Сцяпан Вячорка, Малыш, Альжбета Кудзёлка, Мікіта Рэпа, Іосіф Бэнсь | | | | |
| Патап Каландзёнак, Дземідзёнак, Дакуліха | | | | |
| Цімох, Цішка Дрозд, Барыска, Мікола і Сымон Біцюгі, Стася | | | | |
| Шыковіч, Зося Савіч, Кейстут, Яраш, Гукан, Гаецкая | | | | |

Адказы:

| Героі | Назва твора | Аўтар | Жанр | Лішні герой |
|---|---|---|---|---|
| Дзядька Ігнат, Арына, Віктар, цётка Аўгіння | "Сена на асфальце" | Апавяданне | Міхась Стральцоў | Тамаш |
| Адольф Яхімоўскі, Сцепаніда, Пятрок, Лявон Багацька | "Знак бяды" | Аповесць | Васіль Быкаў | Міхал Кагут |
| Алесь Загорскі, Чорны Война, Вежа, Майка Раўбіч | "Каласы пад сярпом тваім" | Раман | Уладзімір Караткевіч | Мар'яна |
| Сцяпан Вячорка, Альжбета Кудзёлка, Мікіта Рэпа, Іосіф Бэнсь | "Родныя дзеці" | Раман у вершах | Ніл Гілевіч | Малыш |
| Дземідзёнак, Дакуліха | "Дзівак з Ганчарнай вуліцы" | Апавяданне | Іван Чыгрынаў | Патап Каландзёнак |
| Цімох, Цішка Дрозд, Мікола і Сымон Біцюгі, Стася | "Сямнаццатай вясной" | Апавяданне | Іван Навуменка | Барыска |
| Шыковіч, Зося Савіч, Яраш, Гукан, Гаецкая | "Сэрца на далоні" | Раман | Іван Шамякін | Кейстут |

**13. Заданне "Працягні назву"**

Устаўце слова, якога не хапае ў назве, запішыце жанр і аўтара.

| Назва твора | Слова ў назве, якога не хапае | Жанр твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| “Барбара …” | | | |
| “Меч …” | | | |
| “Страсці па …” | | | |
| “Вяртанне да …” | | | |
| “Адна …” | | | |
| “Пісьмо ў …” | | | |

Адказы:

| Назва твора | Слова ў назве, якога не хапае | Жанр твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| “Барбара …” | Радзівіл | Драматычная паэма | Раіса Баравікова |
| “Меч …” | Рагвалода | Гістарычная драма | Алесь Петтрашкевіч |
| “Страсці па …” | Аўдзею | Народная драма | Уладзімір Бутрамееў |
| “Вяртанне да …” | віны | Раман | Іван Чыгрынаў |
| “Адна …” | капейка | Навела | Уладзімір Сцяпан |
| “Пісьмо ў …” | Рай | Раман-споведзь | Алесь Савіцкі |

**14. Заданне “Чые зборнікі?”**

Суаднясіце назву зборніка з аўтарам і яго фотаздымкам.

| Назва зборніка | Аўтар | Фотаздымак аўтара |
|---|---|---|
| 1. “Кружка з пясчаным дном”, “Узаемнасць” | I. Міхась Пазнякоў | А.  |
| 2. “Кляновік”, “Журавінавы востраў”, “Парад планет” | II. Мар’ян Дукса | Б.  |
| 3. “Час надзеі”, “Усміхаюцца зоры над хатаю”, “Спявае жыта…” | III. Уладзімір Карызна | В.  |
| 4. “Рамонкавы бераг”, “Слухаю сэрца” | IV. Юрась Свірка | Г.  |
| 5. “Горн прымірэння”, “Прыйсці да алтара” | V. Алесь Бадак | Д.  |

| | | |
|---|---|---|
| 6. “Зарніцы дзяцінства”, “Доля Русь наша Белая” | VI. Навум Гальпяровіч | Е.  |
| 7. “За ценем самотнага сонца”, “Маланкавы посах” | VII. Раіса Баравікова | Ё.  |
| 8. “Брама”, “Востраў душы”, “Святло ў акне” | VIII. Генадзь Пашкоў | Ж.  |

Адказы: 1 – IV – Е. 2 – VIII – Б. 3 – I – В. 4 – VII – Д. 5 – II – Ё. 6 – III – А. 7 – V – Ж. 8 – VI – Г.

**15. Заданне “Што аб’ядноўвае пісьменнікаў?”**

Суаднясіце групы пісьменнікаў з неабходнымі фактамі пра іх.

| Група пісьменнікаў | Факты пра пісьменнікаў |
|---|---|
| Група 1<br>Ніл Гілевіч<br>Рыгор Барадулін<br>Пімен Панчанка | I. Нашы сучаснікі |
| Група 2<br>Іван Шамякін<br>Васіль Быкаў<br>Андрэй Макаёнак<br>Янка Брыль<br>Іван Чыгрынаў<br>Іван Навуменка | II. Народныя паэты |
| Група 3<br>Раіса Баравікова<br>Генадзь Пашкоў<br>Віктар Шніп<br>Людміла Рублеўская<br>Уладзімір Сцяпан<br>Уладзімір Бутрамееў | III. Пісьменнікі-юбіляры 2023 года |
| Група 4<br>Ніл Гілевіч<br>Іван Навуменка<br>Рыгор Барадулін<br>Міхась Стральцоў<br>Уладзімір Карызна<br>Алесь Бадак | IV. Народныя пісьменнікі |

| | |
|---|---|
| Група 5<br>Мар’ян Дукса<br>Генадзь Пашкоў<br>Навум Гальпяровіч | V. Закончылі БДУ |

Адказы: Група 1 – II. Група 2 – IV. Група 3 – I. Група 4 – V. Група 5 – III.

**16.** Вызначце від падкрэсленых мастацкіх сродкаў ва ўрыўках верша Рыгора Барадуліна “Мая Бацькаўшчына”.

| | |
|---|---|
| З суседзямі падзелішся скарынкаю.<br>Адно не ўмееш з торбаю прасіць.<br>Як ластаўка,<br>з **падстрэшша рук Скарынавых**<br>Тваё крыляла **слова** па Русі... | Ты **бласлаўляла** **даланёй** кляноваю<br>Сваіх сыноў.<br>Слязамі дабяла<br>**Бяліла лён** на світку Каліноўскаму<br>І **ў сны** Ўрублеўскага ты Нёманам<br>**плыла**... |
| Люблю цябе у веснавых праталінах,<br>У **белай хустцы маладых снягоў**. | Як на грыбы, багата ты на таленты –<br>Пільней глядзі і **нерушы** знаходзь. |

Адказы: падстрэшша рук Скарынавых (спадчына Скарыны) – перыфраза; слова – сінекдаха; благаслаўляла даланёй, бяліла лён, у сны плыла – метафары, белая хустка маладых снягоў – метафара; нерушы (таленавітыя людзі, самародкі) – перыфраза.

**17. Заданне “Крыжаванка”**

Адкажыце на пытанні, адказы запішыце ў неабходныя клеткі.




1. Аўтар кнігі “Нача”, якая пабывала ў космасе (у 1978 годзе была дастаўлена земляку пісьменніка Уладзіміру Кавалёнку на станцыю “Саюз-6”) і праграмнага верша “Прыйдзі аднойчы…”.
2. Аўтар твораў “Цыганы” і “Яўгеній Анегін”, якія пераклаў на беларускую мову Аркадзь Куляшоў.
3. Слова, якога не хапае ў назве твора Івана Пташнікава “… і папка”.
4. Кім была дзяўчынка Аленка Дземідзёнку з апавядання Івана Чыгрынава “Дзівак з Ганчарнай вуліцы”?

5. Аўтар верша “Пазвоніць аднойчы вясна…”.
6. Слова, якога не хапае ў назве твора Івана Шамякіна “Трывожнае …”.
7. Апавяданне Васіля Быкава.
8. Слова, якога не хапае ў назве зборніка Максіма Танка “… вады”.
9. Аўтар твораў “Канон Гарыні”, “Канон Маці”.
10. Жанр твораў “Канон Гарыні”, “Канон Маці”.
11. Памяншальна-ласкальная форма сапраўднага імені Якуба Коласа.
12. Выдуманы міфалагічны дух у п’есе Аляксея Дударава “Князь Вітаўт”.
13 (па гарызанталі). Хваёвае дрэва, пра якое пісаў у сваім творы “Нью-Ёркская сірэна” Анатоль Вярцінскі.
13 (па вертыкалі). Вёска, у якой нарадзіўся Ніл Гілевіч
14. Пагаршэнне агульнага стану дваранства, апісанае ў рамане Уладзіміра Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”.
15. Першая прафесія Васіля Віткі.

Адказы: 1. Зуёнак. 2. Пушкін. 3. Муштук. 4. Унучка. 5. Пашкоў. 6. Шчасце. 7. “Сваякі”. 8. Глыток. 9. Марчук. 10. Навела. 11. Косцік. 12. Купала. 13 (па гарызанталі). Секвоя. 13 (па вертыкалі). Слабада.